# Рухальная сіла — любоў

**Нагрудным знакам Міністэрства культуры “За ўклад у развіццё культуры Беларусі” ушанавана Майя Рубель — кіраўнік заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь народнага ансамбля народнай музыкі “Верхнядзвінскія музыкі”, вакальна-харэаграфічнага ансамбля “Ярыца” Верхнядзвінскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці. Што стаіць за ўзнагародай, даведаемся ў размове з нашай гераіняй.**



**— Майя Генадзьеўна, віншуем вас з высокай галіновай адзнакай!**

— Дзякуй вялікі. Атрымаць нагрудны знак было вельмі хвалююча і крыху нечакана. Прымаючы яго, я поўнілася пачуццём гонару. І не столькі за сябе, колькі за наш Верхнядзвінск, за нашы калектывы, за людзей, з якімі працую. Бо за кожным вынікам стаіць не адзін чалавек, а каманда, аднадумцы: яны вераць, падтрымліваюць, ідуць побач.

**— Адкуль вытокі вашага захаплення творчасцю?**

— Напэўна, як і ў многіх — з дзяцінства. Я родам з Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. У сям'і спявалі і дзядуля, і мама. Гэта была натуральная частка жыцця, якая, відаць, недзе глыбока ўва мне і засталася.

Потым музычная школа — вучылася ігры на баяне, пасля — Наваполацкі дзяржаўны музычны каледж, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры. З кожным этапам прыходзіла разуменне: музыка не проста захапленне, а нешта значна большае. Тое, без чаго сябе ўжо не ўяўляеш. Памятаю момант, які, напэўна, шмат у чым вызначыў маю далейшую дарогу. Убачыла выступленне заслужанага калектыву “Пазер’е” ў Паставах. Глядзела на сцэну і думала: як было б добра калісьці стварыць нешта падобнае. Тады гэта здавалася марай. Цяпер разумею: тое была мэта, якая чакала свайго часу.

**— І яна пачала набываць канкрэтныя формы? Як гэта адбывалася?**

— У 1996-м прыехала працаваць па размеркаванні ў Верхнядзвінскую школу з музыкальна-харавым ухілам. Малады спецыяліст, поўная ідэй... Вельмі хутка з’явілася магчымасць іх рэалізаваць: паставілі задачу падрыхтаваць канцэрт да 9 мая. Сабраліся такія ж маладыя і захопленыя — выкладчыкі, музыканты, танцоры. Вырашылі не абмяжоўвацца звыклым фарматам і звярнуліся да народнай творчасці — песні, танца, жывой музыкі. Падрыхтавалі некалькі нумароў, выступілі ў гарадскім парку. І адразу адчулі водгук. Нас прымалі цёпла, шчыра, з сапраўднай цікавасцю. Пасля гэтага мяне запрасілі працаваць у Верхнядзвінскі цэнтр культуры



і народнай творчасці. Там і нарадзіўся вакальна-харэаграфічны ансамбль “Ярыца”. З яго пачаўся мой асэнсаваны творчы шлях — з канцэртамі, фестывалямі, конкурсамі, паездкамі і пастаянным пошукам уласнага аблічча.

**— Раскажыце, калі ласка, падрабязней пра ансамбль.**

— Ён з самага пачатку быў шматгранным: вакал, харэаграфія, інструментальная група. Кожны кірунак жыў сваім жыццём, але разам яны стваралі адзінае цэлае. Вера Іванаўна Новікава — чалавек, які здолеў згуртаваць нас і даць адчуванне, што мы сапраўды можам.

Спярша я працавала як акампаніятар, з цягам часу прыйшла да кіраўніцтва. Імкнуліся да таго, каб кожны нумар быў маленькай гісторыяй — з настроем, ідэяй, нечаканымі рашэннямі. Заўсёды хацелася здзіўляць і кранаць.

Яшчэ, што адметна, большая частка ўдзельнікаў — аматары. Людзі розных прафесій, з рознымі рытмамі жыцця, са сваімі клопатамі. Усіх аб’ядноўвае любоў да песні, музыкі, танца. Ансамбль стаў прасторай, дзе можна адпачыць душой, адчуць сябе часткай чагосьці большага.

**— “Верхнядзвінскія музыкі” — іншы кірунак. У чым яго адметнасць?**

— Хацелася сабраць музыкантаў, гатовых эксперыментаваць, шукаць новыя фарбы — і ў 2011-м такі калектыў з’явіўся. Усяго сем чалавек, але кожны — яркая асоба са сваім характарам і музычным мысленнем. Цымбалы, гармонік, дудкі, саксафон, укулеле... Часам уключаем у выступленні звычайныя пабытавыя рэчы, напрыклад, чыгункі. Гэта выклікае шчырую эмоцыю, ажыўляе залу.

Таксама актыўна ўдзельнічаем у фестывалях і конкурсах, шмат выступаем. Летась калектыву прысвоілі званне “Заслужаны”. Безумоўна, гэта гонар — але разам з тым і вялікая адказнасць. Бо ўжо іншы ўзровень, які трэба пацвярджаць кожным выхадам на сцэну. Калі пасля выступлення гучаць шчырыя апладысменты — разумееш: усё не дарэмна.

**— Ці складана народнай творчасці заставацца ў сучасных умовах цікавай?**

— Народнае — гэта аснова, душа. Безумоўна, можна і трэба шукаць новыя формы, але нельга губляць сутнасць. Важна захаваць тую самую мелодыку народнай песні, адчуваць мяжу, за якой эксперымент ужо не ўзбагачае, а разбурае. Калі ўсё зроблена асцярожна, шчыра, якасна — гэта знаходзіць водгук. І ў дарослых, і ў моладзі, што асабліва радуе.

**— Як удаецца аб’ядноўваць калектыў і захоўваць згуртаванасць з году ў год?**

— Адзінства не ўзнікае само па сабе — яно будуецца праз працу, добразычлівую, здаровую атмасферу і праз сумесны адпачынак.

Таму развіваем жыццё па-за сцэнай. У нас ёсць свае традыцыі, якія ўжо — неад’емная частка нашай гісторыі. Праводзім навагоднія, калядныя святы, сустрэчы з элементамі абраду, адзначаем дні нараджэння — заўсёды творча, з невялікімі сцэнарыямі, жартамі, нумарамі.

Часам збіраемся абмеркаваць канцэрт за кубкам кавы, пасмяяцца. Здавалася б, дробязі — але менавіта яны ствараюць тую атмасферу, у якой хочацца застацца.

Аднак, вядома, галоўная сіла — любоў да справы. Калі ідзеш на працу з радасцю — вялікае шчасце. Калі бачыш вынік, калі вакол людзі, у якіх гараць вочы, — гэта натхняе і дае сілы рухацца далей.

**— Наперадзе шмат планаў?**

— Безумоўна. Хочацца, каб была пераемнасць. Мая мара — стварыць дзіцячыя калектывы, каб традыцыя ішла далей. Каб былі маленькія “музычкі”, маленькія “ярычкі”, якія працягнуць тое, што мы пачалі. Важна развіваць уласную адметнасць. Бо толькі так жыве душа. Жыве культура.

**Ганна КАЛІНІНА**

Фота з архіва гераіні

